# ЗВЫШРЭАЛІЗМ АПОВЕСЦІ А.КАЗЛОВА “ДЗЕЦІ НОЧЫ”

**М. Страха**

У цэнтры аўтарскай увагі ў новай аповесці А.Казлова складаны і супярэчлівы сучасны свет, у якім дабрыня, шчырасць, каханне, справядлівасць усё часцей выцясняюцца злом, жорсткасцю, гвалтам, беззаконнем. Імкнучыся сутнасна асэнсаваць працэс духоўнага абмялення грамадства, пісьменнік даследуе адвечную праблему суадносін дабра і зла “знутры”, на псіхалагічным узроўні як у дачыненні да асобнага чалавека, так і супольнасці ў цэлым, уводзячы пры гэтым у тканіну твора містычныя вобразы і матывы.

Вобраз фантасмагарычнага жорсткага Гаспадара, які ў аповесці ўвасабляе ўладу цемры, набывае ў мастацкай сістэме твора выключна важнае значэнне: ён з’яўляецца характаралагічным у адносінах да іншых персанажаў. Так, Гаспадар умела выкарыстоўваючы маленькія і вялікія чалавечыя слабасці ўжо падпарадкаваў сабе многіх, сярод якіх і дваццацігадовы Максім Гурон. Але зло жадае ўстанаўлення сваёй абсалютнай улады над светам і людзьмі,ператварэння іх у “гуронаўцаў”, “дзяцей ночы”, таму і змагаецца за душы такіх, як Вілен. Герой аповесці з паказальным “ленінскім” імем, параджэннем эпохі вялікіх сацыяльных пераменаў і надзей, у дзяцінстве быў пакінуты сваёй маці. Не менш драматычнае і яго сучаснае жыццё: Вілен “жыве” на вакзале сярод бруду і перманентна п’яных істот. Імя героя – гэта такі ж рудымент вялікай і непераможнай, як здавалася раней, ідэі сцвярджэння свабоднага і шчаслівага чалавека, як і яго ўнутраны свет. У сённяшнім дні, калі вядзе рэй Гаспадар цемры, душа, духоўнасць становяцца беспрытульным. Таму зноў грамадства, ці значная яго частка, апынулася “на ростанях”, толькі на гэты раз з відавочнымі абавязковымі атрыбутамі вакзальнага віру жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Трэба сказаць, што матыў вакзала набліжае аповесць А.Казлова да сюррэалістычных карцін С.Далі. Відаць, нідзе так востра не адчуваецца "цякучасць" хронасу, як на вакзале, дзе столькі разнастайных гадзіннікаў, дзе людзі-пасажыры, падпарадкоўваючыся ўсемагчымым раскладам, сустракаюцца і развітваюцца, прыязджаюць і з'язджаюць. Вакзальная часовасць набывае якасці рэгулярнасці і па-зачасавага пастаянства, як і існаванне тут "бамжоў". Твор, такім чынам, нягледзячы на пашырэнне ў ім містычнай плыні, становіцца звышрэальным. У гэтай сувязі нельга не адзначыць, што ва ўмоўна-фантастычнай аповесці А.Казлова адчуваюцца элементы канцэпцыі філасофіі сюррэалістычнай свабоды. У прыватнасці, такія яе складнікі, як Бергсанава ідэя па-задыскурсіўнасці сапраўднага пазнання, тэорыя Дыльтэя аб ролі фантазіі ў мастацкім спасціжэнні ісціны, псіхааналітызм класічнага фрэйдызму і трактоўка ім падсвядомасці як сферы рэалізацыі поўнай свабоды. Разам з тым А.Казлоў свядома ці не аспрэчвае істотнейшы пастулат сюррэалізму аб дзяцінстве як зоне сапраўднага быцця. Калі, згодна з А.Брэтонам, дзецям нават самыя дрэнныя матэрыяльныя ўмовы здаюцца цудоўнымі, для іх заўсёды "лясы светлыя", то, як можа пераканацца чытач, А.Казлоў, распавядаючы пра драматычнае дзяцінства свайго героя, па сутнасці, абвяргае тэзіс аб заўсёднай светлыні дзіцячага існавання. Ужо ад самых першых крокаў па зямлі чалавеку можа быць прышчэплены вірус, які выклікае працэс паступовай маральнай дэградацыі, што прыводзіць да знікнення асобы і з'яўлення духоўнага рабства. Яго індыкатарам становіцца безасабовае "мы". Яно падпарадкоўвае сабе, а потым і знішчае індывідуальнасць. На змену ёй прыходзіць безаблічная маса гуронаў, вырашчаная Гаспадаром, са сваімі квазікаштоўнасцямі, якія яна імкнецца навязаць кожнаму.

Ці магчыма гэтаму супрацьстаяць? На думку А.Казлова, ёсць толькі адзін шлях барацьбы з духоўным счарненнем, з цемраю. Гэта маральнае развіццё асобы. Прычым праца душы, як вынікае з аповесці, зусім не абавязкова павінна адбывацца мэтанакіравана, усвядомлена. Галоўная роля ў такім працэсе можа належыць не рацыянальнай, а эмацыянальнай сферы, не думкам, а перажываванням, часам нават неўсвядомленым, неасэнсаваным ці паўасэнсаваным пачуццям. Сапраўды, калі інтэлект паставіў чалавецтва ў XX стагоддзі на краю прорвы, паміж быццём і небыццём, А.Казлоў "давярае" ўжо не розуму, а пачуццёва-эмацыянальнаму баку жыцця чалавека. Пісьменнік даводзіць, што асоба здольна мяняцца ў лепшым накірунку не столькі праз актыўную працу думкі, колькі праз назапашванне аднапарадкавых, прынамсі станоўчых, настрояў і перажыванняў. Так, гераіня аповесці Ніна, шукаючы Вілена, кіруецца выключна пачуццем – каханнем і смуткам па свайму любаму. Менавіта пад уплывам эмацыянальнага націску яна адчувае, што з Віленам здарылася нейкая бяда. У сваю чаргу Вілен, выратоўваючы Ніну ад небяспекі ахвярапрынашэння, робіць гэта таксама не ўсведамляючы сваіх дзеянняў, амаль інтуітыўна. А інтуіцыя – гэта фундаментальная катэгорыя сюррэалізму. Не выпадкова адзін з ідэолагаў "сапраўднай рэальнасці" І.Голь сцвярджаў, што сюррэалізм адмаўляе сродкі, якія абапіраюцца на другасныя абстрактныя паняцці – логіку, эстэтыку, граматычную эфектыўнасць ці гульню слоў, – і зноў адкрывае прыроду і першапачатко-

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

вия адчуванні. У гэтай сувязі трэба адзначаць, што сюррэалістычны прынцып свабоднай асацыятыўнасці становіцца вядучым у мастацкай сістэме аповесці "Дзеці ночы".

Аўтар твора, адлюстроўваючы унутраны свет героя, узнаўляе незразумелыя праз рацыянальнае душэўныя рухі, асобныя настроі – гэта значыць найбольш схаваныя і цяжэй за ўсё падыходзячыя для мастацкага ўзнаўлення і аналізу пласты жыцця. Творчасць А.Казлова пераконвае, што звышрэалізм як мастацкі прынцып да гэтага часу не актуальным і здольным адкрываць перад мастаком слова і чытачамі прынцыповыя, у тым ліку і новыя, далягляды раскрыцця і спасціжэння унутранага свету асобы.